

Што для вас значыць Вялікая Перамога?

Важнае | Грамадства | Свежыя навіны

29.10.2019 administrator 1856

У гісторыі ёсць падзеі і даты, перад якімі і праз дзесяцігоддзі ўдзячныя нашчадкі схіляюць галовы.

Важнай гістарычнай падзеяй для беларускага народа з'яўляецца Вялікая Перамога. Цікава было даведацца ў нашых землякоў, якія пачуцці, асацыяцыі, думкі выклікае ў іх гэта свята.

Генадзь Суравец, ваенны камісар Дзятлаўскага раёна:



– Вялікая Перамога – гэта перамога сілы, розуму, шчасця над горам. Гэта прадаўжэнне жыцця ў імя тых, хто ахвяраваў сабой дзеля святой і вялікай мэты. Цяпер самае галоўнае для нас, спадкаемцаў тых слаўных традыцый і ідэй, – абараняць наша мірнае неба, шанаваць і беражліва захоўваць памяць аб загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, вучыць гэтаму нашых дзяцей.

Міхаіл Губар, старшыня раённага савета ветэранаў:

– Перамога над фашызмам – гэта магчымасць для ўсіх нас жыць мірна, не баяцца прыгнёту, быць свабоднымі. Савецкія воіны, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, забяспечылі нам гэта шчаслівае жыццё. Яны дастойны памяці і шанавання. Шанаванне і шчырых словаў удзячнасці дастойны нашы ветэраны. На жаль, на Дзятлаўшчыне іх засталося толькі шэсць чалавек. Раённы савет ветэранаў клапоціцца аб іх, дапамагае, віншуе са святамі.

Кацярына Хілімончык, першы сакратар раённага камітэта ГА “БРСМ”:

– Дзень Вялікай Перамогі блізкі кожнаму чалавеку, бо ён аб’ядноўвае нас праз подзвіг ваеннага пакалення. Безумоўна, мы не можам аддзячыць тым, каго з намі няма, за мірнае

неба і свабоду, але можам схіліцца да зямлі перад тымі, хто адстаяў жыццё будучых пакаленняў. Лічу, пакуль жыве памяць аб Вялікай Перамозе, мы будзем заставацца свабоднымі, шчаслівымі, годнымі жыць пад мірным небам.

Іаан Кісель, благачынны цэркваў Дзятлаўскай актугі:



– Вялікая Перамога – гэта вялікая магчымасць для ўсяго народа жыць на сваёй зямлі, сваімі традыцыямі, захоўваць праваслаўную веру, будаваць сваю будучыню. Гэты дзень і традыцыя яго адзначаць свяшчэнныя для ўсяго нашага народа. Слава тым воінам, якія жыцці свае склалі на полі бою за веру, за Айчыну, за нашу культуру. Праваслаўная Царква заўсёды ўзносіць свае малітвы і за іх, і за ветэранаў, якія яшчэ з намі. Для кожнага з нас Вялікая Перамога – напамін аб тым, што на Зямлі мы павінны прытрымлівацца Закона Божага, а гэта закон любові. Ён дадзены, каб на Зямлі не было войнаў, чалавечых ахвяраў, каб не пралівалася кроў.

Ангеліна Андрукевіч, вучаніца 6 клас СШ № 1 г. Дзятлава:

– Вялікая Перамога – гэта наша гісторыя, якую варта ведаць, бо яна тычыцца не толькі цэлай краіны, але і кожнай сям'і. Напрыклад, мой прадзядуля па мамінай лініі быў на

фронце і вярнуўся жывым. На жаль, я яго ўжо не застала, затое ў сям'і захоўваліся яго франтавыя пісьмы і родныя расказвалі, што ў яго было нямала ўзнагародаў, сярод якіх медаль "За ўзяцце Берліна". Я ганаруся сваім прадзядулем.

Ірына КАЎКЕЛЬ

Теги: 76 лет Великой Победы

ВСТУПАЙТЕ В НАШУ ГРУППУ «ВКОНТАКТЕ»

ЧИТАЙТЕ ТАКЖЕ:

Узнагароды сем'ям-пераможцам

18.05.2019



Выбраем антисептык против коронавируса

06.01.2021

ДОСААФ отпраздновал новоселье

26.10.2018

МЫ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

ЛЕНТА НОВОСТЕЙ



РИКЗ: изменить предмет ЦЭ после окончания регистрации нельзя

17.04.2024 Комментарии отключены



У добрых спраў ёсць адрасы

17.04.2024 Комментарии отключены



Па тэме з аналітыкай. Як павысіць даход у пенсійным узросце?

17.04.2024 Комментарии отключены



Навіны бібліятэкі. Вясёлы свет дзіцячых кніг Валерыя Квілорыі

17.04.2024 Комментарии отключены



Александр Лукашенко: открытый диалог и взаимовыгодное сотрудничество между Минском и Дамаском будут углубляться

17.04.2024 Комментарии отключены



Около 500 нарушений охраны труда выявлено профсоюзами гродненщины с начала посевной кампании

17.04.2024 Комментарии отключены



Влияние энергетических напитков на здоровье

17.04.2024 Комментарии отключены



10 000 шагов это полезно

17.04.2024 Комментарии отключены

ПОСЛЕДНЕЕ ПОПУЛЯРНОЕ ОБСУЖДАЕМОЕ



РИКЗ: изменить предмет ЦЭ после окончания регистрации нельзя

17.04.2024 Комментарии отключены



У добрых спраў ёсць адрасы

17.04.2024 Комментарии отключены



Па тэме з аналітыкай. Як павысіць даход у пенсійным узросце?

17.04.2024 Комментарии отключены



Навіны бібліятэкі. Вясёлы свет дзіцячых кніг Валерыя Квілорыі

17.04.2024 Комментарии отключены



Александр Лукашенко: открытый диалог и взаимовыгодное сотрудничество между Минском и Дамаском будут углубляться

17.04.2024 Комментарии отключены



Около 500 нарушений охраны труда выявлено профсоюзами гродненщины с начала посевной кампании

17.04.2024 Комментарии отключены



Влияние энергетических напитков на здоровье

17.04.2024 Комментарии отключены



10 000 шагов это полезно


17.04.2024 Комментарии отключены

ГАЗЕТА

ПЕРАМОГА
ДЯТЛОВСКАЯ РАЙОННАЯ ГАЗЕТА
DIATLOVONEWS.BY

Все права принадлежат редакции газеты «Перамога». При использовании публикаций сайта, ссылка на источник и автора обязательна. Перепечатка материалов только с письменного разрешения редакции. Активная и индексируемая гиперссылка на источник материала обязательна.

СТАТИСТИКА САЙТА



ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Комарова Ирина Чеславовна
+375-1563-3-29-60

E-MAIL

drgp21@mail.ru, drgp@diatlovonews.by

ПРИЕМ РЕКЛАМЫ

Лещун Марина Антоновна
+375-1563-3-29-62

© 2018 Дятлово | «Перамога» | Все права защищены